**ЛИТЕРАТУРА**

1. Статистические показатели Азербайджана. Госкомстат АР. Баку. 2013
2. Демография и статистика населения / под редакцией И.И. Елисеевой. – М.: Финансы и статистика, 2006.
3. О. Воробьева, А. Багат, Т. Долбик-Воробей, Г. Киселева**.** Практикум по статистике населения и демографии. – М. Финансы и статистика, 2011.
4. Эфендиев В.А., Нагиев С.К. География населения. – Изд-во БГУ, 2005
5. www.azstat.org

## АСАБЛІВАСЦІ ТУРЫСТЫЧНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**К.В. Андрэйчык, У.А. Ганскі**

*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Наваполацк, Беларусь*

Polotsksu

У працэсе развіцця турызму, ператварэння яго ў масавую сацыяльна значную з’яву асаблівае значэнне набывае пытанне эфектыўнага планавання, рэгулявання і аптымізацыі турыстычнай дзейнасці. Усё больш краін усведамляюць важнасць правядзення турыстычнай палітыкі, якая з’яўляецца неад’емнайársткай знешняга і ўнутранага курсу краіны. Мэтанакіраваны ўплыў дзяржавы на турызм, а таксама звязаныя з ім працэсы пачынаюць адбывацца з 1960-1970-х гг., калі колькасць турыстычных міграцый стала ўзрастаць хуткімі тэмпамі. Менавіта ў гэты перыяд перад дзяржавай паўстае пытанне аб неабходнасці эфектыўнага рэгулявання сферы турызму.

Сення турыстычная палітыка разглядаецца як мэтанакіраваныя паслядоўныя дзеянні дзяржаўных, прыватных структур і грамадскіх арганізацый па распрацоўцы і рэалізацыі мер знешнепалітычнага, прававога, эканамічнага, сацыяльна-культурнага і інфармацыйнага характару, якія забяспечваюць эфектыўнае развіццё ўязнога і ўнутранага турызму і спрыяюць павышэнню аўтарытэта дзяржавы на міжнароднай арэне.

Рэспубліка Беларусь у сістэме кіравання турыстычным комплексам рэалізуе «еўрапейскую» мадэль (з цэнтральным дзяржаўным рэгулюючым органам), якая ў нашай краіне мае шэраг асаблівасцяў. У прыватнасці, гэта звязана з тым, што Беларусь з’яўляецца адносна маладой суверэннай дзяржавай, якая не валодае дастатковым вопытам у сферы рэгулявання турызма і знаходзіцца ў пастаянным пошуку шляхоў удасканалення механізму яго развіцця. Другой асаблівасцю выкарыстання гэтай мадэлі ў Беларусі з’яўляецца факт пабудовы ў нашай краіне сацыяльна арыентаванай эканомікі з захаваннем вядучай ролі дзяржаўнага сектара. З улікам таго, што турыстычны комплекс у рамках нацыянальных гаспадарак, як правіла, мае ярка выяўленую рынкавую скіраванасць, дадзены падыход адрозніваецца ад вопыту замежных краін.

У Беларусі распрацоўка і рэалізацыя турыстычнай палітыкі ажыццяўляецца Міністэрствам спорту і турызму, у якім у 2004 г. створаны Дэпартамент па турызму і Нацыянальнае агенцтва па турызму. На гэтыя структуры ўскладзена распрацоўка, каардынацыя, рэгуляванне турыстычным комплексам і пытанні

прасоўвання нацыянальнага турыстычнага прадукту. У сілу міжгаліновага характару турыстычнага комплексу ў рэалізацыі нацыянальнай турыстычнай палітыкі краіны ўдзельнічаюць каля 20 міністэрстваў і ведамстваў, што абумовіла неабходнасць стварэння ў 2000 г. пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Міжведамаснага экспертна-каардынацыйнага савета па турызме.

Стварэнне эфектыўнай нацыянальнай турыстычнай палітыкі з'яўляецца найважнейшай задачай сучаснага развіцця дзяржаў. Вытокі фарміравання сучаснай турыстычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь былі закладзены ў 1960-1970-х гг., калі павелічэнне ролі і значэння турызму ў грамадстве было абумоўлена наяўнасцю ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы таго перыяду адпаведнага напрамка, які ў наш час атрымаў вызначэнне як «турыстычная палітыка». З мэтай разумення глыбіні пераўтварэнняў, праведзеных беларускім грамадствам у 1990-я гг., і выкладу канцэптуальнай спецыфікі сучаснай турыстычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь неабходна зрабіць кароткі аналіз яе рэалізацыі ў 1970-1980-я гг.

Асаблівасцю развіцця турызму ў той перыяд быў манапольны характар дзяржавы на ажыццяўленне турыстычнай дзейнасці, якая забяспечвалася функцыянаваннем толькі трох суб'ектаў гаспадарання – Галоўінтурытста БССР, Беларускага савета па турызме і экскурсіям і БММТ «Спадарожнік» ЦК ВЛКСМ. Уязны турызм развіваўся больш высокімі тэмпамі, чым выязны. У 1980 г. у аб'еме экскурсійнага абслугоўвання па рэспубліцы прыбыцці склалі 68%, а адпраўленні – 32 %. Экскурсійны турызм быў вядучым напрамкам турызму, колькасць удзельнікаў экскурсій у 1980 г. узрасла ў 5 разоў у параўнанні з 1970 г. і склала 6,8 млн чал. Значна больш сціплым быў міжнародны турыстычны абмен. Так, у 1980 г. па лініі Галоўінтурыста і Беларускага савета па турызме і экскурсіям было накіравана за мяжу 14 740 чал. План быў выкананы на 105,4%. Строга вытрымліваўся сацыяльны статус асобаў, якія выязджалі за мяжу. У ліку турыстаў пераважалі інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя. Партыйныя камітэты ўвялі ў практыку рэгламентацыю выдачы дазволу на выезд: у сацыялістычныя краіны – раз у два гады, а ў капіталістычныя – адзін раз у тры гады.

У рэалізуемай у 1970-1980-я гг. турыстычнай палітыцы неабходна вылучыць дзве групы фактараў: спрыяўшых яе ажыццяўленню і аб'ектыўна паніжаўшых эфектыўнасць яе правядзення. Фактарамі, якія забяспечвалі яе рэалізацыю, з'яўляліся: устойлівае бюджэтнае фінансаванне турыстычнага комплексу, уключэнне нацыянальнага турыстычнага прадукту ва ўсесаюзную сістэму яго прасоўвання, значная роля прафсаюзаў у частцы фінансавай падтрымкі адпачынку працоўных, узрастаючы ўзровень адукацыі і матэрыяльнага забеспячэння насельніцтва. Фактары, якія стрымлівалі развіццё турызму, былі: жорсткая адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання, партыйна-дзяржаўны манапалізм у грамадстве, адсутнасць рэальнага самастойнага выхаду Беларусі на міжнародны турыстычны рынак, адсутнасць навучальных устаноў па падрыхтоўцы кадраў для турыстычнай галіны, самастойных дзелавых кантактаў з міжнароднымі турыстычнымі арганізацыямі і вопыту працы на сусветным турыстычным рынку, няведанне яго правілаў, патрабаванняў і стандартаў.



Polotsk.su

Такім чынам, аналіз турыстычнай палітыкі ў 1970-1980-х гг. сведчыць аб тым, што яе ажыццяўленне вялося ва ўмовах жорсткага партыйна-дзяржаўнага рэгулявання. Наяўнасьць «жалезнай заслоны» і празмерны кантроль дзяржавы тармазілі міжнародны турыстычны абмен, а адсутнасць канкурэнтнага асяроддзя адмоўна адбівалася на якасці турыстычных паслуг.

З 1990-1992 гг. у турызме пачаліся працэсы дэманапалізацыі, раздзяржаўлення, прыватызацыі, што было звязана з рэалізацыяй лібэральна-рынкавай мадэлі рэфармавання народнагаспадарчага комплексу краіны. З ліквідацыяй манаполіі дзяржавы атрымала развіцце дэзінтэграцыя ў сферы кіравання знешнеэканамічнай дзейнасцю. Пры гэтым руйнавалася матэрыяльная база турызму, адпрацаваныя тэхналогіі прыему і абслугоўвання турыстаў, не праводзіўся статыстычны ўлік.

Рэалізацыя такой мадэлі фактычна прывяла да страты кіраванасці турыстычным комплексам Беларусі. Як вынік, за гады эканамічнага крызісу (першая палова 1990-х гг.) значна знізіліся тэмпы новага рэкрэацыйнага будаўніцтва, матэрыяльная база фізічна і маральна састарэла. Некаторыя ведамасныя ўстановы адпачынку з-за фінансавых цяжкасцяў былі зачынены, ёмістасць шэрагу іншых рэкрэацыйных аб’ектаў значна паменшылася. У цэлым жа развіцце турыстычнага комплексу Беларусі на першым этапе рэфармавання (1990-1995 гг.) характарызавалася шэрагам спецыфічных асаблівасцяў:

1) масавы прыход у сферу турызму ў пачатку 1990-х гг. прыватнага бізнесу не быў забяспечаны неабходнай нарматыўна-прававой базай, што стварала ў грамадскай свядомасці ілюзію шырокай даступнасці і арганізацыйнай спрошчанасці гэтага віду бізнесу. Становішча ўскладнялася адсутнасцю прафесійных кадраў, так як практычна не было навучальных установ па іх падрыхтоўцы;

2) краіна не мела самастойнага выхаду на міжнародны турыстычны рынак, а дзелавыя кантакты з міжнароднымі і нацыянальнымі замежнымі турыстычнымі арганізацыямі былі мінімальнымі;

3) доўгі час (аж да 1995 г.) на дзяржаўным узроўні адсутнічаў адзіны каардынуючы турыстычны орган.

Важным крокам па ўдасканаленню дзяржаўнага кіравання сферай турызму з’явілася стварэнне ў лістападзе 1995 г. Міністэрства спорту і турызму (да гэтага кіраванне турызмам ажыццяўлялася Міністэрствам зьнешнеэканамічных сувязяў).

На другім этапе (з 1996 г. па цяперашні час), калі было прынята стратэгічнае рашэнне аб пабудове сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі пры вядучай ролі дзяржавы, у Беларусі быў праведзены наступны комплекс мер па развіцці турызму, які забяспечвае аднаўленне кіраванасці турыстычным комплексам і павышэнне эфектыўнасці яго функцыянавання: у 1999 г. быў прыняты Закон «Аб турызме»; Міністэрства спорту і турызму пачало рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы развіцця фізічнай культуры, спорту і турызму на перыяд да 2002 г., ўвяло ў практыку ліцэнзаванне дзейнасці турыстычных фірмаў; у снежні 2000 г. была прынята Нацыянальная праграма развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на 2001-2005 гг. Пазітыўныя вынікі ў гэты перыяд былі да-

polotsk.su

сягнуты і ў практычнай дзейнасці: створаны Нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст», Нацыянальнае агенцтва па турызме, заснаваны Беларуская федэрацыя турызму, Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў і інш. Такім чынам, на другім этапе рэфармавання фактычна пачала фарміравацца дзяржаўная турыстычная палітыка ва ўмовах абнаўлення беларускага грамадства і пераходу на рынкавы шлях развіцця.

Адкрытасць межаў і магчымасць бесперашкоднага выезду грамадзян з'явіліся магутнымі фактарамі, стымулюючымі выязны турызм, які стаў развівацца больш высокімі тэмпамі, чым уязны, паколькі ў часы СССР кантакты з сусветнай супольнасцю і выхад на сусветны рынак былі вельмі абмежаваныя і строга рэгламентаваліся. Свабода перамяшчэння праз межы стала рэальнай і была гарантаваная арт. 30 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Пачынаючы з 2000 г. у Беларусі былі актывізаваныя меры па сістэмнаму развіццю турызму. Прынятая Нацыянальная праграма развіцця турызму на 2000-2005 гг., а пазней – на 2006-2011 гг. і на 2011-2015 гг. Праграмы былі падмацаваныя практычнымі мерапрыемствамі, у іх былі зменены акцэнты на прыярытэтнае развіццё турызму ў рэгіёнах краіны. Пастановай Савета Міністраў у 2005 г. на тэрыторыі краіны былі створаны 27 турыстычных зон.

Рэгіянальная турыстычная палітыка рэалізуецца ў кантэксце агульнай нацыянальнай стратэгіі і пакліканая максімальна выкарыстоўваць мясцовую спецыфіку для павышэння значнасці рэгіёнаў у развіцці турыстычнай галіны. Такая сістэмная праца і была пачата ў рэгіёнах краіны: распрацаваны абласныя (гарадскія і раённыя) праграмы і мерапрыемствы па развіццю турызму да 2010 г., разгорнута работа па іх выкананню.

Прававой асновай для развіцця турызму сталі Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №371 «Аб некаторых мерах дзяржаўнай падтрымкі развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь» і №372 «Аб мерах па развіццю аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь» ад 2 чэрвеня 2006 г. Першым Указам ад падатку на дабаўленую вартасць і ад падатку на прыбытак вызваляліся паслугі па рэалізацыі ўязнога, унутранага турызму, экскурсійнай дзейнасці на працягу 3 гадоў з пачатку дзейнасці турыстычных аб'ектаў. Дакументам таксама ўводзіліся гарантыі абароны інвестыцый, накіраваных у індустрыю гасціннасці. Другі Указ закладваў прагрэсіўную нарматыўную базу для развіцця аграэкатурызма. Дакументам прадугледжвалася аднаразовая аплата уладальнікам аграсядзібы збору ў памеры адной базавай велічыні ў год. Фактычна ўпершыню ў Беларусі былі ўведзеныя прагрэсіўныя нормы арганізацыі сельскага турызму па заяўным прынцыпе.

У 2008 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №185 «Аб некаторых пытаннях ажыццяўлення дзейнасці ў сферы аграэкатурызму» быў пашыраны пералік асоб, якія могуць займацца сельскім турызмам, дазвалялася на тых жа прынцыпах аказваць турыстычныя паслугі не толькі жыхарам сельскай мясцовасці, але малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. У частцы рэалізацыі пазначаных Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Саветам Міністраў быў прыняты шэраг нарматыўна-прававых актаў у галіне турызму. Толькі ў 2008 г. іх было прынята сем.

Polotsk SU

Стварэнне прывабнай нарматыўна-прававой базы стымулявала ініцыятыву вяскоўцаў. Ужо па выніках ў 2006 г. у Беларусі былі створаны 34 аграсядзібы. Аднак селяніну складана ўладкаваць сваю сядзібу і вытрымліваць высокія стандарты абслугоўвання турыстаў без фінансавай дапамогі дзяржавы. Далучэнне да гэтага праекту «Белаграпрамбанка», у частцы прадастаўлення льготнага крэдыту (пад 5% тэрмінам на 7 год), значна актывізавала развіццё сельскага турызму ў краіне. За 2009 г. банкам была аказана фінансавая падтрымка 220 суб'ектам аграэкатурызму на суму 7,5 млрд бел. руб. З 118 раёнаў краіны суб'екты сельскага турызму атрымалі падтрымку «Белаграпрамбанка» ў 81 раёне. Такі зацікаўлены падыход не мог не адбіцца на выніках. Ужо ў 2009 г. колькасць аграсядзібаў павялічылася да 884. Суб'ектамі сельскага турызму ў 2009 г. было зарэгістравана ўжо больш за 70 тыс. турыстаў, у тым ліку больш за 2 тыс. – замежных.

Паступова інтэгруюцца ў міжнародны турыстычны рынак 303 санаторна-курортныя ўстановы Беларусі, ажыццяўляючы экспарт санаторна-курортнага турпрадукту на рынках краін-суседзяў (пераважна Расіі). Колькасць замежных турыстаў, прынятых беларускімі здраўніцамі, расце. У 2006 г. яны прынялі амаль 80% замежных спажыўцоў санаторна-курортнага турпрадукта. Прыкладам паспяховага аб'яднання санаторна-курортных установаў Беларусі з'яўляецца прадпрыемства «Белпрафсаюзкурорт», санаторыі «Крыніца», «Беларусачка», «Лётцы», «Нарач», «Нарачанскі бераг», «Прыдняпроўскі» і інш. Яны – адны з лепшых у краіне па якасці паслуг, узроўню інфраструктуры і ступені інтэграванасці ва ўнутраны і міжнародны турыстычны рынак. Аднак неабходна адзначыць аднабаковую экспартную арыентацыю айчынных санаторна-курортных установаў – пераважна на расійскі рынак (каля 70% турпатоку), на якім беларускі турпрадукт па суадносінах кошту і якасці найбольш прывабны па прычыне нізкай яго вартасці. Такі падыход стварыў цяжкасці ў забеспячэнні паслугамі аздараўлення ўнутры Беларусі. Стратэгія развіцця экспарту санаторна-курортнага турпрадукту павінна быць накіравана на размежаванне экспартных і сацыяльных функцый установаў аздараўлення, аптымізацыю цэнавай палітыкі здраўніц і павышэнне кваліфікацыі іх персаналу.

Актывізавалася праца па развіцці турызму ў малых і сярэдніх гарадах. Рэалізацыя праграмы развіцця турызму ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі дазволіла палепшыць іх імідж за кошт адкрыцця турыстычных аб'ектаў, павелічэння патоку турыстаў, стварэння новых працоўных месцаў, росту тавараабароту ў рэгіёнах.

Асаблівыя намаганні дзяржавы былі накіраваны на рэканструкцыю 11 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Толькі ў 2008 г. на гэтых аб'ектах было асвоена каля 40 млрд руб. Рэстаўрацыйныя работы вяліся ў замкавым комплексе г.п. Мір, царкве ў Сынкавічах, сядзібным комплексе ў в. Чырвоны Бераг і комплексе будынкаў былога калегіума езуітаў у в. Юравічы Гомельскай вобласці, палацава-паркавым ансамблі г. Нясвіж, палацы Румянцавых-Паскевічаў у Гомелі. Праведзена значная работа па ўладкаванню 259 гасцінічных комплексаў, аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу.

PolessU

Важным аспектамт турыстычнай палітыкі стала ўступленне Беларусі ў 2005 г. у Сусветную турыстычную арганізацыю, што дазволіла актывізаваць удзел у 11 міжнародных турыстычных праектах: Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі ПМГ/ГЭФ і ПРААН/ГЕФ «Стратэгія развіцця турызму ў рэгіенах Брэст-Бяла-Падляска», «Распрацоўка канцэпцыі развіцця экалагічнага турызму ў зоне заказніка «Сярэдняя Прыпяць», Развіцце трансгранічнага супрацоўніцтва ў Еўрарэгіене «Белавежская пушча» (Камянецкі і Пружанскі раёны) і інш. Сёння праводзяцца кансультацыі з суседнікі дзяржавамі-членамі ЕС па пытаннях трансгранічнага супрацоўніцтва ў рамках еўрапейскага інструмента добрасуседства і партнерства, які прыйшоў на змену Праграме TACIC ЕС 1 студзеня 2007 г. Рэспубліка Беларусь ўключылася ў рэалізацыю трох праграмаў добрасуседзтва ЕС: «Польшча-Украіна-Беларусь», «Латвія-Літва-Беларусь» і «Рэгіен Балтыйскага мора».

Яшчэ адным аспектам супрацоўніцтва з ЕС з'яўляецца праграма «Усходняе партнерства», якая прадугледжвае развіццё стасункаў ЕС з шасцю постсавецкімі дзяржавамі, Беларуссю, Малдовай, Украінай, Арменіяй, Азербайджанам і Грузіяй, у трох напрамках: стварэнне свабоднай камерцыйнай зоны, падрыхтоўка да адмены візавага рэжыму з краінамі ЕС і ўключэнне краін-удзельніц праграмы «Усходняе партнерства» у адзіную энергетычную сістэму.

Эвалюцыя інтэграцыйных працэсаў у Еўропе на парадак дня вылучыла такую форму супрацоўніцтва, як еўрарэгіёны. Развіццё турызму ў рамках беларускіх еўрарэгіенаў з'яўляецца актуальным напрамкам турыстычнай палітыкі, важным інструментам павышэння міжнароднага супрацоўніцтва.

Прэзентацыі турыстычных магчымасцей Рэспублікі Беларусь праведзена ў рамках работы Беларуска-аўстрыйскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву ў г. Вене, Беларуска-венгерскага дзелавога форуму ў г.Будапешце і г. Секешфехервары, Беларуска-турэцкай камісіі па турызме ў г. Анталы, а таксама ў час пасяджэння кіраўнікоў адміністрацый краін-удзельніц Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы ў г. Кішынёве і на пасяджэнні Савета па турызме краін СНД у г. Маскве. Арганізаваны пасяджэнні змешаных працоўных груп па турызме з Літоўскай Рэспублікай.

Беларусь, з'яўляючыся актыўным удзельнікам міжнароднай сістэмы турызму, актыўна пашырае міжнародныя сувязі ў сферы турызму на аснове двухбаковага супрацоўніцтва. Да гэтага часу наша краіна падпісала 23 міжурадавых і міжведамасных пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне турызму, прычым частка з іх тычыцца непасрэдна пытанняў актывізацыі супрацоўніцтва ў турыстычнай сферы, іншыя ж прадугледжваюць пашырэнне ўзаемадзеяння па розных кірунках, у тым ліку і ў галіне турызму.

Такім чынам, турыстычная палітыка Беларусі ў цяперашні час скіравана на рашэнне комплекснай стратэгічнай задачы – рэструктурызацыі экспартнага патэнцыялу на аснове павелічэння долі турыстычных паслуг, пашырэння геаграфіі іх экспарту і стварэння прывабнага іміджу краіны. У сувязі з гэтым пры фарміраванні нацыянальнай турыстычнай палітыкі варта ўлічваць асноўныя тэндэнцыі ў міжнародным турызме і ў развіцці міждзяржаўных адносін.